# НАБЫЦЦЁ СТАТУСА АДВАКАТА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ І РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ. ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ

**В. А. Канапацкая**

У канцы 80х – пачатку 90х гадоў XX ст. пачаліся глыбокія палітычныя і сацыяльна-эканамічныя рэформы ў краінах-былых удзельніцах саюза ССР. Гэта абумовіла неабходнасць унясення зменаў і ў арганізацыю і дзейнасць адвакатуры. Новы этап у развіцці беларускай адвакатуры быў адкрыты Законам Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 1993г. «Аб адвакатуры», уведзеным у дзеянне з моманту яго апублікавання. Больш за дзесяць гадоў здзяйсняліся беспаспяховыя спробы прыняць закон аб адвакатуры ў Расійскай Федэрацыі. Але ўвесь гэты час там дзейнічала Палажэнне аб адвакатуры, прынятае ў самым пачатку 80-х гадоў. Дзіўная склалася сітуацыя: нарматыўны акт дзейнічаў, а рэальнае жыццё ішло як бы апрача яго. Федэральны закон «Аб адвакацкай дзейнасці і адвакатуры ў Расійскай Федэрацыі» быў прыняты толькі 31 траўня 2002 г.

Параўноўваючы сучаснае беларускае і расійскае заканадаўства аб адвакатуры, трэба адзначыць, што ў абедзвюх дзяржавах ёсць несумненныя поспехі ў рэфармаванні гэтага інстытута. Але ўяўляецца, што закон «Аб адвакацкай дзейнасці і адвакатуры ў Расійскай Федэрацыі» адрозніваецца лепшай тэхнічнай распрацаванасцю. Варта ўзгадаць, што ён змяшчае шмат важных палажэнняў аконт Кваліфікацыйнай камісіі і парадку здачы кваліфікацыйнага экзамена. Па гэтых пытаннях беларускі закон спасылаецца на падзаконныя акты. І нават само вызначэнне паняцця «адвакат», як уяўляецца, даецца больш удала.У беларускім законе вызначэнне тэрміна «адвакат Рэспублікі Беларусь» даецца ў 7 артыкуле, дзе разам з тым знаходзяцца патрабаванні да прэтэндэнта на набыццё статуса адваката. У расійскім законе вызначэнне тэрміна «адвакат» даецца ў артыкуле 2, а патрабаванні да прэтэндэнта – у артыкуле 9 «Набыццё статуса адваката». Як відаць, вызначэнне паняцця «адвакат» раскрываецца не толькі праз патрабаванні да яго, але робіцца акцэнт на тым, што гэта незалежны дарадчык па прававых пытаннях, прыводзяцца некаторыя паўнамоцтвы адваката, якія падрабязней раскрываюцца ў арт.6, закранаюцца пытанні допуску адвакатаў замежных краін да аказання юрыдычный дапамогі на тэрыторыі Расійскай Федерацыі.

Параўноўваючы нормы аб патрабаваннях да прэтэндэнтаў на набыццё статуса адваката законаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, можна знайсці наступныя падабенствы:

- прэтэндэнты павінны мець вышэйшую юрыдычную адукацыю;
- стаж работы па юрыдычнай спецыяльнасці або праходжэнне стажыроўкі;
- здача кваліфікацыйнага экзамена;
- да заняцця адвакацкай дзейнасцю не дапускаюцца собы, прызнаныя ва ўсталяваным заканадаўствам парадку недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі.

Але характарызуючы законы Рэпублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі аб адвакатуры, можна прыйсці да высновы, што ў плане дэмакраычнасці нормаў аб допуску да адвакацкай дзейнасці расійскі закон адрозніваецца большай дасканаласцю. Гэта тычыцца і магчымасці набыцця статуса адваката замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, і замацавання нормы аб нядопуску да адвакацкай дзейнасці асобамі, якія маюць непагашаную або не знятую судзімасць за ўчыненне наўмыснага злачынства, а не асобамі, якія раней учынілі наўмысныя злачынствы, як гэта замацавана ў беларускім законе, і правіла бястэрміновага набыцця статуса, у адрозненне ад беларускай нормы аб дзеянні ліцэнзіі на працягу пяці гадоў. Але сам факт наяўнасці ў Рэспубліцы Беларусь ліцэнзірвання адвакацкай дзейнасці лічу даволі прагрэсіўнай з'явай.

Некаторыя аўтары, у прыватнасці Д. Е. Зелянеўскі, лічаць, што ўсталяванае айчынным заканадаўствам патрабаванне – наяўнасць грамадзянства Рэспублікі Беларусь – нельга расцэньваць як дыскрымінацыйнае [3, с.48], што таксама адзначаецца ў міжнародных дакументах. Але вядомы расійскі адвакат М.Ю. Баршчэўскі прытрымліваецца іншага погляду: «Мы свядома апускаем дэфініцыю «грамадзянін Расійскай Федэрацыі», паколькі, з нашага пункту гледжання, няма нейкіх відавочных прычын «апрыоры» пазбаўляць магчымасці асобаў без грамадзянства, грамадзян СНД, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Расіі, а магчыма, і грамадзян «дальняга замежжа» (пры пэўных умовах) права на заняцце адакацкай дзейнасцю на тэрыторыі Расіі. Іншая справа, што стаж работы, наяўнасць спецыяльнай адукацыі, здача экзамена, атрыманне ліцэнзіі – гэта ўжо ўмовы, абавязковыя для ўсіх» [1, с.66–67].

Нягледзячы на некаторае ўдакладненне першапачаіковага тэкста артыкула 10 Закона аб адвакатуры Рэспублікі Беларусь Законам ад 6 ліпеня 1998 г. ранейшае здзяйсненне няўмыснага злачынства як падстава для нядопуску да адвакацкай дзейнасці, на думку некаторых аўтараў[4, с.113], сфармуліравана недастаткова карэктна, без уліку такіх прын-

цыпаў крымінальнага права, як справядлівасць і гуманізм. Бо ўзнікае пытанне: а калі з моманту здзяйснення, скажам, мелкай кражы або знявагі, прайшло дваццаць гадоў, мера пакарання была ўмоўнай, судзімасць знята ці пагашана, меў месца акт амністыі, або закон, па якім быў асуджаны грамадзянін, страціў сілу, і дзеянне перастала быць крымінальна каральным? Ва ўсіх гэтых выпадках, як уяўляецца, няма ніякіх падстаў пазбаўляць грамадзяніна права працаваць адвакатам[1, с.117]. Гэта тым больш прынцыпова, калі ўлічыць, што пералічаныя ў Законе падставы абмежавання допуску да адвакацкай дзейнасці распаўсюджваюцца не толькі на асобаў, якія маюць неабходны стаж работы па спецыяльнасці юрыста і жадаюць здаць кваліфікацыйны экзамен з мэтай атрымання ліцэнзіі на права займацца адвакацкай дзейнасцю, але і на стажораў, памочнікаў адвакатаў. Варта адзначыць, што ў праекце расійскага закона аб адвакатуры першапачаткова ўтрымлівалася патрабаванне нездзяйснення ганебных учынкаў. Але, як відаць, расійскі заканадаўца адмовіўся ад яго.

Можна адзначыць, што прэтэндэнты на атрыманне статуса адваката ў Расійскай Федэрацыі карыстаюцца большымі гарантыямі. У пацверджанне дастаткова адзначыць, што прэтэндэнт можа звяртацца ў суд і калі яму адмаўляюць у допуску да кваліффікацыйнага экзамена (пры ўмове адпаведнасці патрабаванням, пералічаным у п.п. 1 і 2 арт. 10 Закона аб адвакацкай дзейнасці), і пасля яго здачы, і пры неўнясенні звестак аб адвакаце ў рэгіянальны рэестр альбо нявыдачы адвакату пасведчання. У Рэспубліцы Беларусь можна абскардзіць у суд толькі нявыдачу ліцэнзіі Міністэрствам юстыцыі.

У сувязі з гэтым можна прапанаваць некаторыя меры па ўдасканаленні айчыннага заканадаўства па пытанні набыцця статуса адваката. Гэта, перш за ўсё, змяненне нормы аб нядопуску да адвакацкай дзейнасці асобаў, якія раней здейснілі наўмысныя злачынствы, на норму аб нядопуску да гэтай дзейнасці асобаў, якія маюць непагашаную або не знятую судзімасць.

Па-другое, скасаваць патрабаванне наяўнасці грамадзянства пры допуску да адвакацкай дзейнасці.

Па-трэцяе, вярнуць раней дзейнічаўшую норму аб бястэрміновай выдачы адвакацкіх ліцэнзій.

Па-чацвёртае, прадугледзець больш гарантый для прэтэндэнтаў пры здачы кваліфікацыйнага экзамена, атрыманні ліцэнзій і пасведчанняў.

Па-пятае, прапаную ўвесці прысягу адваката. Гэта тым больш мэтазгодна, калі ўлічыць, што ў нашай рэспубліцы ўжо існуюць прысягі суддзі і натарыуса.

Канешне, шлях да дасканаласці бясконцы. І ўлічваючы велічыню важнасці існавання і дзейнасці адвакатуры ў любой краіне, вялікую адказнасць, якую ўскладаюць на сябе тыя, хто абараняе правы і законныя інтарэсы чалавека ў судзе, дасканаленне заканадаўства аб адвакатуры таксама набывае надзвычайную важнасць. Бо, як адзначыў Міністр юстыцыі В. Г. Галаванаў, «Адвакатура – барометр сталасці грамадства. Па тым, як развіваецца інстытут адвакатуры, па яго месцы і ролі ў грамадстве, яго магчымасцях, уменні забяспечваць юрыдычную дапамогу грамадзянам і юрыдычным асобам мяркуюць аб тым, у якой ступені дзяржава прыхільна прынцыпам дэмакратыі, гуманізма, наколькі поўна і ўсебакова забяспечваюцца правы і свабоды чалавека» [2, с.8–10].

**Літаратура**


1. *Барщевский М.Ю.* Организация и деятельность адвокатуры в Росиии. Научно-практическое пособие. М. Юристъ. 1997. 320 с.
2. *Голованов В.Г.* Международное законодательство и реализация права граждан Беларуси на юридическую помощь.// Юстыцыя Беларусі. 1998. №3. с.8–10.
3. *Зеленевскй Д.Е.* Приобретение статуса адвоката в соответствии с законодательством Республики Беларусь.// Право Беларуси. 2003. № 21 (45). с. 48.
4. *Мартинович И.И.* Адвокатура Беларуси: история и современность // И.И. Мартинович. Мн. Тесей. 2002. 176 с.


## ПОНЯТИЕ АДМИНИСТРАТИВНОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТИ


**А. Н. Конюшко**


В настоящее время доминирующим подходом к пониманию такой сложной категории как административная ответственность является, так называемый, «наказательный» подход. Он сводит административную ответственность к наказанию, санкции, фактически отождествляя их. Можно выявить две основные точки зрения по этому поводу, господствующие в литературе. Первая точка зрения административную ответственность определяет как реакцию государства на правонарушение, реализацию санкции нарушенной нормы права (Д.А. Гавриленко, Д.М. Овсянко, Л.Л. Попов и др.). Вторая позиция определяет ее как обязанность правонарушителя претерпевать неблагоприятные последствия в результате совершения правонарушения (О.Э. Лейст.).

Обе группы авторов, отстаивающие их, соглашаются, что административная ответственность является сложным правоотношением, что связано с административным принуждением. Нельзя не признать правильность этих утверждений. Однако авторы описывают административную